***Ведаць гісторыю роднай зямлі — ведаць сябе.***
***Прысвячаю роднай Гомельшчыне.***



# МАЛЕНЬКАЯ КАРАЛЕВА ЕЎДАКІЯ ТУРАЎСКАЯ

***Гістарычная драма ў 2-х актах, 4 з'явах.***

*У 2005 годзе над астанкамі храма XII стагоддзя ў Тураве была ўведзена музейная скрыпта. Пры раскопках, якія вяліся адначасова з будаўніцтвам, нічога адметнага знойдзена не было, хіба што некалькі саркафагаў, у адным з якіх — маладая дзяўчына, гадоў сямнаццаці-дзевятнаццаці... Першая думка, якая наведала маю грэшную галаву, калі пабачыў косці, што праляжалі больш васьмі стагоддзяў, — гэта Яна... Мае ж думкі сталі сягаць далей і далей, пакуль не нарадзілася гэтая п'еса. Канешне, як і ў любым мастацкім творы тут шмат прыдуманага, але я стараўся прытрымлівацца гістарычнай праўдзе, што хоць крыху дайшла да нас. Хаця ж пра якую праўду можна казаць праз стагоддзі?! Але я веру, што сапраўды пахавана ў саркафагу — маленькая каралева Еўдакія Тураўская.*



Уладзімір Гаўрыловіч



## ЭПОХА КАХАННЯ І ЗДРАД

***Перадгісторыя сюжэта***

Дагэтуль існуе стэрэатып, нібыта прыгожая частка чалавецтва ніяк альбо вельмі мала ўплывала на ход гістарычных падзей. І жанчынам па звычцы адводзіцца другаступенная роля: жонак, каханак, натхняльніц мужчын на подзвігі, стварэнне твораў мастацтва, духоўнасці…

Тураўская зямля ў гэтым плане можа пахваліцца сваёй адметнасцю. На мяжы XI і XII стагоддзяў — змрочны час палітычнай неразбярыхі, міжусобіц, жорсткіх войнаў — тураўская княгіня Гертруда (пасля прыняцця праваслаўя — Алісава (Лізавета) выступала супраць міжусобіц і за самастойнасць Тураўскай зямлі.

Звесткі аб Гертрудзе захаваліся ў «Аповесці мінулых часоў», шмат таксама звестак у польскіх хроніках, а выява — у вядомым Трырскім псалтыры, зробленым па яе заказу (мае яшчэ назву «Кодэкс Гертруды»).

Польская каралеўна, сястра польскага караля Казіміра I, стала жонкай тураўскага князя Ізяслава, аднаго з шасцярых сыноў Яраслава Мудрага ў 1043 годзе. Ізяславу дастаўся старажытны, таямнічы Тураў якраз па яго паўналецці — гэта быў самы непакорны з гарадоў-васалаў кіеўскага князя. Найбольш уплывовыя людзі Турава яшчэ з часоў мяцежнага Святаполка, празванага Акаянным, прывыклі больш глядзець у бок суседняй Польшчы, чым Кіева, марылі аддзяліцца ад Кіева. Яны «перавыхоўвалі» на свой капыл любога кіеўскага стаўленіка літаральна за год-другі. Не стаў выключэннем і малады, бязвольны Ізяслаў. Баяры пераканалі яго ажаніцца на польскай каралеўне, і шлюб гэты адбыўся вельмі хутка.

Летапісцы пасля скажуць пра Гертруду, што яна — выдатны палітык, самая адукаваная з тагачасных еўрапейскіх правіцельніц. Іншую характарыстыку атрымлівае яе муж — асоба супярэчлівая, апанаваная многімі нездаровымі страсцямі, на якога гісторыкі ўскладваюць асноўную адказнасць за крывавую ўсобіцу, якая ўспыхнула на землях усходніх славян пасля смерці Яраслава Мудрага.

Спачатку ж Гертруда, калі пасялілася ў тураўскім палацы, не праяўляла сябе актыўна, займалася справамі сямейнымі, нараджала дзяцей. Свайму мужу яна падаравала Мсціслава, Святаполка, Яраполка, дачку Еўдакію. Яна, як сведчаць летапісы, ва ўсім падпарадкоўвалася мужу, хаця не магла не заўважаць яго слабавольнасці, нерашучасці, няздольнасці на рашучы ўчынак. І раптам гэтаму чалавеку выпала заняць вялікакняжы кіеўскі прастол — памёр яго старэйшы брат, Уладзімір Яраслававіч, а за ім і бацька Яраслаў Мудры. У 1054 годзе, перад самай смерцю, вялікі князь Яраслаў прызваў да

сябе сына і, ведаючы яго слабасць як правіцеля, завяшчаў яму любіць братоў, раіцца з імі ва ўсім і не дапускаць усобіц. Сын пакляўся бацьку. І больш дзесяці гадоў строга трымаўся клятвы. Але ўжо каля 1067 года паміж трыма братамі Яраславічамі пачынаецца разлад.

Слабавольны Ізяслаў наслухаўся нагавораў малодшага брата Святаслава і разам з ім, не паслухаўшыся мудрай жонкі, якая разумела да чаго можа прывесці ўсобіца, вырашылі пазбавіць незалежнасці Полацк, «разабрацца» з пляменнікам Усяславам, які там княжыў (вядомы ў гісторыі Беларусі як Усяслаў Чарадзей). Вынікам крывавага паходу стала спаленне Мінска, жорсткая бітва на Нямізе, падман, крыжаадступніцтва, кінуты ў Кіеве ў цямніцу-поруб Усяслаў…

Гертруда была расчаравана сваім мужам, яна разумела, што, акрамя вялікай на векі ганьбы, гэты паход Кіеву нічога не прынясе, і ведала, што расплата будзе хутка.

Так і адбылося. Праз год на Русь напалі полаўцы, і войска Яраславічаў было разбіта, а князі дружна пабеглі ратавацца кожны ў свой горад. Кіеўляне запатрабавалі ад Ізяслава зброю, але ён спалохаўся. Тады пачаўся мяцеж, і кіеўляне выпусцілі з цямніцы Усяслава Чарадзея… Ізяслаў разгубіўся, і жонка параіла яму прасіць дапамогі ў польскай радні — у Польшчы ўжо правіў другі брат Гертруды Баляслаў II. Муж так і зрабіў — захапіўшы з сабой каштоўнасці, паехаў у Польшчу.

Тым часам Усяслаў быў узведзены кіеўлянамі на вялікакняжацкі прастол, і Гертруда не магла не пераканацца, што гэты чалавек больш варты быць вялікім князем, паклялася сабе, што памірыць яго са сваім бязладным мужам.

Ізяслаў дамогся свайго: вярнуў з дапамогай польскага войска сабе Кіеў, але не захацеў паслухацца жонкі і прымірыцца з Усяславам, успомніць бацькаў наказ, пасябраваць з пляменнікам. Наадварот, у 1071 годзе ён праганяе з Полацка Усяслава, і садзіць стольнікам туды свайго сына Мсціслава, юнака, як сведчаць летапісцы, жорсткага і славалюбівага. Аднак сын нядоўга княжыў, раптоўна памёр. Гертруда была ў роспачы, і сказала мужу толькі адно: «Цябе праклялі нябёсы! І табе быць выгнаннікам…»

Уражаны смерцю сына, Ізяслаў раскаяўся, нават перанёс у спецыяльна пабудаваны храм астанкі загінуўшых ва ўсобіцах святых Барыса і Глеба, а пасля пачаў рабіць спробы прымірэння з пляменнікам. Аднак братам-Яраславічам гэта не спадабалася, і яны выгналі яго з Кіева. Ізяслаў з жонкай і сынамі збег у Польшчу, дзе дзейсная княгіня бярэ ўсе клопаты на сябе. Брат Гертруды адмаўляецца дапамагаць надакучлівай радні, і яна шукае дапамогі ў немцаў. Гертруда дабіваецца спачування імператара



Генрыха IV, саксонскага маркграфа Дэдзі. Княгіні ўдаецца ажаніць свайго малодшага сына Яраполка на нямецкай графіні Кунігундзе, каб займець тут надзейных саюзнікаў. Каб дагадзіць папе рымскаму Грыгорыю VII, які пры жаданні можа дапамагчы яе мужу, вяртаецца да сваёй ранейшай веры. Настойліва, дзень за днём, тонкі палітык Гертруда набліжала Ізяслава да вяртання на Радзіму, і верыла, што яе муж здольны паказаць сябе вартым князем.

Мара яе збываецца. У 1078 годзе памірае Святаслаў Яраслававіч, брат Ізяслава, і Гертруда дапамагае мужу сабраць войска з палякаў, каб вярнуць законны кіеўскі прастол. Але раіць яму неяк паспрабаваць дамовіцца з апошнім братам, Усеваладам, уладкаваць справу мірам. Так удалося вярнуць Ізяславу прастол без кровапраліцця.

Але ў гэтым жа годзе Ізяслаў і загінуў. Мудрая жонка ўгаворвае яго раз і назаўсёды скончыць з усобіцай, якая перайшла ў спадчыну ад сыноў Яраслава Мудрага да ўнукаў — уступае ў бой з полаўцамі, якіх прывялі родныя пляменнікі. Непрыяцельскі вершнік ударыў яго кап'ём — і вялікі князь адразу памёр. Нямецкія храністы тады засведчылі, што Гертруда доўга аплаквала мужа, якога ўсё ж кахала, але адначасова дзякавала Богу, што паслаў яе мужу такі годны канец.

Пасля гібелі Ізяслава кіеўскі прастол заняў яго брат Усевалад, а Гертруда паехала ў Тураў, дзе стаў княжыць яе сын Яраполк. Яна не магла пагадзіцца з другаснай роляй свайго сына, унушыла Яраполку ідэю збліжэння з Польшай і самастойнасці Турава ад Кіева. Яе падтрымалі і баяры. І гэтаму, мабыць, было б суджана збыцца, калі б непрадбачана ў выніку згавору феадалаў не загінуў яе брат, польскі кароль Баляслаў II. Яго спадчыннік, Мешка III, быў яшчэ малалеткам, не мог працягнуць справу бацькі і ва ўсім павінен быў слухацца свайго апекуна, вянгерскага караля Уладзіслава.

Кіеву ж бяльмом на воку была «тураўская вольнасць», і вялікі кіеўскі князь Усевалад Яраслававіч паслаў на Тураў свайго сына, Уладзіміра Манамаха. Тураўцы разумелі: з такім моцным войскам, якое вёў Уладзімір, ім не справіцца. Каб не губіць людзей, яны параілі Яраполку хавацца ў Польшчы. Яраполку не было выбару...

Гертруда і сынава жонка-немка Кунігунда вырашылі застацца ў Тураве. Разам з братам у Польшчу сабралася юная княжна Еўдакія — дзяўчына моцная, вынослівая, выхаваная тураўлянамі незалежнаю і свабодалюбіваю. Копія сваёй маці…

## АСОБЫ:

**Еўдакія Тураўская**, княжна Тураўская, у час дзеі — каля 16 год, каралева Польшчы.

**Князь Яраполк Тураўскі**, 26 год.

**Княгіня Гертруда** (у праваслаўі — Алісава), маці Яраполка і Еўдакіі, 45 год, вялікая княгіня Тураўская і Кіеўская, дачка польскага караля Казіміра І.

**Княгіня Ірына** (нямецкая графіня Кунігунда), жонка Яраполка, каля 20 год.

**Мешка III**, сын Баляслава II, юны кароль Польшчы.

**Кароль Уладзіслаў Вянгерскі**, апякун будучага караля Польшчы, 40 год.

**Ядвіга**, пакаёўка.

**Баярын Іван**, правая рука князя Кіеўскага і Тураўскага Ізяслава, 50 год.

**Ваявода Земіслаў**, польскі магнат.

Ваяводы кіеўскія і кракаўскія, прадстаўнікі польскай знаці.

Дружыннікі.

Падзеі адбываюцца ў Тураве, Кракаве,
Кіеве на працягу 1085 -1089 гадоў.

## АКТ ПЕРШЫ

### З'ЯВА 1.

*Тураўскі палац, святліца княгіні Гертруды.*

**Гертруда** *(чытае пасланне і змяняецца з твару)*. Святы Пётр!!!

**Яраполк.** Маці-княгіня, няўжо зноў кепскія весткі?

**Гертруда**. Твая праўда, Яраполк. Апошні час з усходу дабра чакаць не прыходзіцца. Верны чалавек з Кіева паведамляе: дзядзька Усевалад ідзе на Тураў *(спалохана)*. Яго сын, Уладзімір, па загаду бацькі, узняў дружыну супраць нас.

**Еўдакія** *(разгублена і злосна адначасова)*. Ганьба Кіеву…

**Яраполк** *(спакойна)*. А нам — смерць. Мы не вытрымаем аблогу і тры-чатыры дні. Сама больш — тыдзень.

**Еўдакія** *(спалохана)*. Што ж цяпер будзе?

**Яраполк** *(роспачна)*. Будзем стаяць да смерці, а Тураў Уладзіміру не аддамо. Гэта наша зямля…

**Гертруда.** Не гарачыся, сынок. Сабраць баяраў трэба. І — думаць. Але найперш з баярынам Іванам трэба раду мець: верны нам ён, сынок, сярод тураўскай знаці — паважаны чалавек, бацькі твайго, Ізяслава, правай рукой заўсёды быў. Праўда, ты забыўся апошнім часам на яго, а дарэмна.

**Яраполк.** Ты, маці, як заўсёды, праўду кажаш. (Дружынніку). Кліч у двор баярына Івана, хутка.

*Дружыннік выходзіць.*

**Гертруда** *(балюча)*. Чорная хмара плыве на Тураў. Зноў.

**Яраполк**. Будзем біцца… Як Бог павядзе — так таму і быць. І калі памерці суджана ў сечы…

**Гертруда**. Не гарачыся, сыне. Трэба не пра смерць думаць. Пра будучыню. Светлую, шчаслівую. Для Турава, для сябе, дзяцей будучых.

**Яраполк**. Мама, мама, але ж нам не дадуць супакою. Дзядзька Усевалад не змірыцца з нашай вольніцай… За ім — большая сіла.

**Гертруда**. Усявышні ўсё бачыць і чуе. Усевалад — сваё вядзе, а мы — свайго трымацца будзем…

**Пакаёўка** *(убягае ў святліцу, радасная)*. Дазвольце, княгіня… Добрая вестка, князь: княгіня Ірына разрадзілася.

**Яраполк** *(узрадаваўся)*. Жонка! Які я кепскі муж — за сваімі клопатамі забыўся на яе зусім. Ну, кажы, хутчэй…

**Пакаёўка**. Дачушка ў вас, княжа. Моцная дзяўчынка, дзябёленькая.

**Гертруда**. Слава Богу. Прымі, святы заступнік, на свет грэшны новае жыццё, дай шчасце і долю маёй унучцы!

**Яраполк** *(крыху засмучона)*. Што ж, дачка... Добра… і дачка, хаця ж сына хацеў першынца…

**Гертруда**. Як дасць Гасподзь, патрымаеш і сына. Віншую, мой дарагі. Будзе твая дачка вялікай княгіняй альбо каралевай польскай, як яе бабуля Гертруда.

**Яраполк** *(рассмяяўся)*. Мама, у цябе планы… далёкія…

**Еўдакія** *(да брата)*. Ды пайшлі ўжо, не церпіцца на маленькую пагляд-зець.

**Гертруда**. Ідзіце, дзеці.

**Яраполк**. А ты?

**Гертруда**. Я пасля. Івана дачакаюся.

*Дзеці выходзяць.*

### З'ЯВА 2

*Гертруда адна.*

**Гертруда** *(перад іконай, становіцца на калені)*. Святы ойча! Заступіся і зберажы маю сям'ю. Даруй усе прыграшэнні мужа майго, гарэмніка Ізяс-

лава! Устронь пакрыўджаных ім, вялікім князем кіеўскім! Дай ім мудрасці! Не ад злобы душэйнай, а ад слабавольнасці і бязладнасці каханы мой муж парушыў запавет бацькі свайго, вялікага князя Яраслава Мудрага, любіць братоў сваіх. І расплаціўся ўрэшце смерцю, за бяздумнасць сваю… Даруй, Божа, за учынкі благія, дзякуй, што паслаў хоць яму годны жыцця канец…

Даруй нябожчыку, мужу майму, вялікую страту, што каменем на сэрцы будзе покуль жывая буду: смерць першынца нашага, любімца майго Мсціслава. Чаму толькі, Божа, Ізяслаў не паслухаўся, замуціўся яго розум і прагнаў са стала Полацкага свайго пляменніка Усяслава, пасадзіў замест таго сына нашага? Нябёсы былі супраць, я ведала гэта, і смерць сына на чужыне так рана, няўчасна забрала яго ў маці… *(плача)* Божа, можа я нечым пакрыўдзіла цябе і святых апосталаў? Што не адгаварыла, не магла паўплываць на думкі княжыя мужа свайго?.. Навошта быў той кіеўскі прастол, калі няшчасці такія цяжкія, непамерныя? І цяпер — зноў бяда, распалата за дзеянні твае, Ізяславе! Бяда над нашым Туравам, які ў ліхую гадзіну прымаў нас назад, як дзяцей сваіх, вяртаў сілу. Дай, Божа, моцы цялеснай і розуму, князю Тураўскаму Яраполку, сыну майму малодшаму. Блаславіце, заступнікі нябесныя, навучыце сына думаць сэрцам сталага мужа, не дапусціць памылак бацькі. Заступіцеся за дзяцей маіх. Дайце сілы тураўлянам выстаяць і не скарыцца гневу Усевалада Яраслававіча. Амінь…

### З'ЯВА 3

**Дружыннік** *(з парога)*. Княгіня, баярын Іван тут.

**Гертруда** *(устае з каленяў, хрысціцца)*. Не трымай жа баярына за дзвярыма…

**Баярын Іван** *(уваходзіць у святліцу, кланяецца)*. Доўгалецця табе, княгіня-маці.

**Гертруда.** І табе, тваёй радзіне, Іване. Даўно мінаў маю святліцу, як быццам адцураўся? Няўжо ўгнявіла чым? Кажы…

**Баярын Іван** *(узрушана)*. Святая Марыя, не слухай гэтую жанчыну, думкамі пра якую жыццё прайшло і з яе імем зямлю пакіну…

**Гертруда** *(здзіўлена)*. Іване…

**Баярын Іван.** Даруй, княгіня-маці, старому дурню. Але хоць перад смерцю — прызнаюся. Люба ты мне, Алісава, яшчэ са сватоў і вяселля твайго з Ізяславам — люба. Ды ж ці мог думкі грэшныя мець. Сцяўся, жыў з жонкай, дзяцей падняў, а цябе адну, хоць сівы зрабіўся, кахаю.

**Гертруда** *(падышла да яго і раптам пацалавала ў лоб)*. Дзякуй, Іване. Я



ведала, здагадвалася… Але я была вернай жонкай Ізяславу, кахала і кахаць буду аднаго яго, свайго дурня-нябожчыка.

**Баярын Іван.** Што ўжо ўспамінаць. Нічога не зменіш, гады прайшлі. Я зусім ужо стары. А ты такая ж — прыгожая польская дзяўчынка, каралеўна. За цябе Бог заступіўся…

**Гертруда.** Я такая ж старая ўжо, як і ты, Іване. І — няшчасная.

**Баярын Іван.** Цябе людзі любяць, хоць ты і не маеш ранейшай улады. Да твайго слова многія прыслухоўваюцца дагэтуль у Кіеве і Польшчы. Княгіню-маці любяць тураўляне. Тураў вольны. Вакол, дзякаваць Богу, спакойна. Хіба гэтага мала?

**Гертруда** *(засмучона)*. Не ўсё так проста, баярын…

**Баярын Іван.** Маю Алісаву нешта непакоіць?

**Гертруда.** Усевалад скарыць хоча. Бяльмо яму наш Тураў у воку. Узнімае руку на братавага сына.

**Баярын Іван** *(усхвалявана)*. Кіеў… У каторы раз Яраслаў Мудры перавернецца ў магіле — няма супакою Яраслававу роду.

**Гертруда.** Таму і пазваў цябе Яраполк.

**Баярын Іван** *(усміхнуўся з сумам)*. Нябёсы, князь Яраполк успомніў старога воя і дарадцу бацькі свайго?! Веры даць цяжка.

**Гертруда.** Іван, не гняві Бога. Мабыць, і мая ў тым віна, што ў двары ты не ў пашане. Яраполк — мой сын. Малады, гарачы, але... Ён добрае памятае. А калі забудзе — я памяць здолею яшчэ прачысціць.

**Баярын Іван.** Я не гневаюся. Маладыя ж да маладых цягнуцца, прырода бярэ сваё. Толькі мудрасць прыходзіць з гадамі.

**Гертруда.** Вось і прыйшла пара мудрасці. Маладосць яе запатрабавала, Іване… Трэба ратаваць Тураў. Не дапусціць братазабойства — Яраполк жадае біцца з Уладзімірам, але разумее, што сілы — няроўныя… Калі ты мяне, Іване, мяне кахаеш, стань, як і ягонаму бацьку, правай рукой. Стань… бацькам.

**Баярын Іван.** А ці будзе слухаць?

**Гертруда.** Малады князь — як неаб'езджаны конь. Гарачы, але не дурны, адходлівы. Разам прывядзём да розуму.

**Баярын Іван.** Алісава, будзь па-твойму. Аднак навіна кепская. Трэба збіраць раду баярскую.

*За сцяной шум.*

**Гертруда** *(сумна ўсміхаецца)*. Не паспее, чуе сэрца, нарадавацца сын. Сёння ж княгіня Ірына, дзякаваць Богу, разрадзілася. Унучка. І будзе ёй імя…

**Баярын Іван.** Дзяўчынка? Перад сечай — гэта благі знак.

**Гертруда.** Цяпер, Іване, не ведаеш, што да чаго і адкуль бяды чакаць. Але я ведаю: гэтая дзяўчынка прынясе яшчэ згоду і мір.

**Баярын Іван.** Няхай спраўдзяцца твае словы, княгіня-маці…

*Уваходзяць Еўдакія і Яраполк. Яраполк трымае немаўля. Іван адыходзіць крыху ўбок.*

**Еўдакія.** Матулька, наша Кунігунда сатварыла цуд! Мая нямецкая братавая проста малайчына. Дзяўчынка такая маленькая і такая прыгожая! Нават не верыцца…

**Яраполк** *(крыўдзячыся на Еўдакію)*. Блазнота, я табе колькі буду гаварыць, каб называла яе Ірынай. Ты ад мяне ў рэшце рэшт атрымаеш… Мама, скажы ёй…

**Гертруда** *(смяецца)*. Ты ж князь — хіба ўлады маеш мала?

**Яраполк.** Ёй — загадаеш! Вырасцілі не княжну, хутчэй, адчайнага юнака.

**Еўдакія** *(рагоча)*. Ці не аслеп ты, брат: я ж дзяўчына!

**Гертруда.** Ну, хопіць вам, лепш пакажыце мне маю ўнучку.

**Яраполк** *(глядзіць на маці)*. Мама, мне здаецца…

**Гертруда** *(бярэ дзіця, радасна)*. Божае стварэнне… Унучка… Кроў Ізяслава і Казіміра. Мая і твая кроў. Няхай вядзе цябе Гасподзь Бог на жыццёвай дарозе, Анастасія…

**Яраполк.** Добрае імя, Анастасія… Думаю, Ірыне спадабаецца.

*Баярын Іван спецыяльна кашляе.*

**Баярын Іван.** Няхай нараджэнне Анастасіі ўмацуе веру ў адзінага Бога ў княжай сям'і. Ты стаў сапраўдным мужам, князь. Вітаю цябе з добрай нагоды ад усяго тураўскага баярства.

*Яраполк крыху разгубіўся. Еўдакія абрадавана падбегла да баярына, абняла, як свайго.*

**Еўдакія.** Дзядзька Іван! Як добра, што вы прыйшлі. Ці ўсё добра ў вашай сям'і? Чаму вы забаранілі прыходзіць да мяне Марыі — я так па ёй сумую…

**Баярын Іван.** Добрая, спагадлівая дзяўчынка! Дзверы майго дома заўсёды былі расчынены для цябе, Еўдакія, ад той пары, калі вучыў цябе стрэлам і ловам, вучыў выбіраць з калоды мёд. Ты заўсёды жаданы госць…

**Яраполк** *(зласнавата)*. Затое князь, валадар Тураўскі, перастаў быць ім у двары баярына Івана.

**Гертруда.** Не кіпяціся, Яраполк. Будзь мужчынам! Баярын усё жыццё стаяў за нашу сям'ю. Твае папрокі недарэчы. Тым больш зараз. Еўдакія…

*Еўдакія ідзе да маці, бярэ ад яе немаўля і выходзіць з ім са святліцы.*



**Яраполк.** Дык ён ужо ведае? Твая воля, маці. Што скажаш, баярын Іван?

**Баярын Іван.** Скажу адно: я — з табою. І заўсёды быў з тваёй сям'ёй, князь, хоць адчуваў апошнія гады… пахаладанне да мяне.

**Яраполк** *(расчулена, паглядзеў на маці, якая загадкава ўсміхнулася сыну)*. Я магу цябе абняць, баярын? Так, як толькі што зрабіла мая сястра?

**Баярын Іван.** Я магу цябе абняць, князь, так, як бы абняў цябе твой бацька Ізяслаў?

**Гертруда.** Абніміцеся і станьце адным: розумам і мудрасцю. Менавіта яны Тураву зараз патрэбны, як ніколі…

**Яраполк.** Я набываю вернага слугу і дарадцу.

**Баярын.** Я клянуся вернасцю князю. А калі адступлюся — няхай меч княжай справядлівасці зробіць сваю справу, і душа няхай пазбавіцца райскага супакаення.

**Гертруда.** Амінь…

### З'ЯВА 4

*Тыя ж, вяртаецца Еўдакія.*

**Еўдакія** *(радасна)*. Яраполк, якое шчасце! Бачыць, што ты памірыўся з дзядзькам Іванам.

**Яраполк.** Я таксама шчаслівы, сястра! Хоць і князь, але кепскі стратэг і палітык, калі нават у сваім акружэнні не разабраўся… Але не пра гэта зараз. *(Да баярына)*. У нас бяда на парозе. Што рабіць, баярын Іван? Ці падтрымаюць мяне тураўляне ў гэтай сечы? Ці выстаім супраць войска, якое вось-вось павядзе з Кіева Уладзімір?

**Гертруда.** Гавары, Іване, так як думаеш. Як пакляўся. Не бойся, нават калі твае словы пакрыўдзяць князя і мяне. Ты — мудры чалавек.

**Баярын Іван.** Тураў, мой князь, княгіня-маці і княжна, насамрэч ніколі не быў пад Кіевам. Князёў ад Кіева прымаў, так, але ніколі не падначальваўся. У гэтым — вялікая таямніца Тураўскага княства. Так было пры дзядах і прадзедах, што шанавалі спрадвечных багоў. Гэта закладзена язычнікам Турам, які паўстаў супраць улады Мёртвага — так называлі напачатку ў нас Бога сапраўднага. Пасля прыйшлі князі кіеўскія, і яны станавіліся за год-два нашымі. Па крыві былі чужынцы, ды душою — тураўляне. Вада з нашых крыніц рабіла іх непакорнымі Кіеву, птушкі спявалі вольна і людзі павінны быць такімі. І хоць вярталіся на кіеўскі пасад, іх душа заставалася тут, блукала ў Тураве. Ніводзін з князёў, валадароў Турава, не знішчыў дарагое яго сэрцу месца, куды мог вярнуцца і спачыць душой. А ваш бацька — вялікі князь Ізяслаў, не выпадкова ажаніўся на табе, Алісава. Гэта першапачаткова быў выбар старэйшын Турава.

**Гертруда.** Нават так?

**Баярын Іван.** Гэта святая праўда, княгіня-маці. З'яўленне польскай каралеўны, каталічкі, на праваслаўнай зямлі — мудры, прадуманы крок старых тураўлян, якія такім чынам зберагалі Тураў некранутым. І — не скараліся Кіеву, бо з захаду была падтрымка Кракава, вялікага караля, свата нашага.

Мой бацька, памятаю, вярнуўся з Кіева: Яраслаў быў у гневе ад таго, што другі яго сын узяў жонку не па веры, каталічку. Але пасля махнуў на гэта рукой, бо не Ізяслаў павінен быў пасля яго смерці стаць вялікім кіеўскім князем, а старэйшы сын, брат Ізяслава, Уладзімір Яраслававіч. Але здарылася непрадбачанае — спадчыннік Кіева раптам памёр. А затым сканаў і сам князь Яраслаў.

**Гертруда.** Да чаго вядзеш, Іване?

**Баярын Іван.** Ты, княгіня-маці, таксама стала больш чым тураўлянкай, хоць і перабралася праз нейкі час у кіеўскія святліцы. Тураў тым часам працягваў жыць сваім жыццём, у якое вы маглі вярнуцца. Сыходзілі і вярталіся, не дапускаючы здзеку над тураўлянамі. Цяпер Яраполк, сын Ізяслава, княжыць у Тураве. І яго лёс, падобны на бацькаў... Незайздроснае становішча...

**Яраполк.** Многа слоў баярын. Якая будзе твая рада?

**Еўдакія.** Брат, дзядзька Іван толькі што пакляўся табе ў вернасці. Не слепні, а выслухай! Паважай мудрасць і гады!

**Яраполк** *(злуецца)*. Маўчы, дзяўчынка, калі мужчыны гавораць. І наогул табе тут не месца. Маці-княгіня!!!

**Гертруда.** Дзеці! Мы на мяжы згубы, а вы — дурэеце. Еўдакія, не ўстравай, дачушка! Ну і характар!

**Еўдакія** *(пакрыўджана)*. Да малодшых спрадвеку так! А я ведаю, ведаю, што рабіць трэба. Толькі мяне ніхто не слухае...

**Баярын Іван** *(усміхаецца, падыходзіць, гладзіць па галаве Еўдакію)*. А дазвольце, князь і княгіня, паслухаць маю любіміцу-выхаванку. Магчыма, маладое семя разумнае што скажа?

**Яраполк.** О, святы Божа! Што слухаць гэтае надакучлівае дзіця!

**Гертруда.** Сынок, набярыся цярпення. Князю не гожа. Яна сястра твая, па крыві родная. Нават калі і такая непакора, як нячысцік, у ёй сядзіць.

**Баярын Іван.** Не гневайся, князь...

**Яраполк.** Ды што яна разумнае скажа?

**Еўдакія.** А тое, што нам не трэба спрачацца з дзядзькам Усеваладам. І расчыніць браму перад Уладзімірам, сустрэць з хлебам-соллю. З Богам сустрэць. Як радня.



**Яраполк.** Ха! Я ж казаў, хіба гэтае стварэнне можа што людное сказаць? Аддаць ім Тураў? Не будзе гэтага! Сам згіну, але на Бацькаўшчыне не будзе Яраславічаў, акром маіх спадкаемцаў, калі застануцца жыць.

**Баярын Іван** *(крыху расчаравана)*. Голас — мужа...

**Гертруда.** Неразумнага.

**Яраполк.** Маці, вы крыўдзіце...

**Еўдакія.** Брат, ты не разумееш?

**Яраполк.** А ты, саплячка, разумееш?!

**Баярын Іван.** Вялікі князь! Я кляўся табе ў вернасці, да згубы. Дай слова мовіць!

### З'ЯВА 5

*Уваходзіць вершнік.*

**Вершнік.** Грамата князю Яраполку з Кіева.

**Яраполк** *(вершніку)*. Ідзі, я дам адказ. *(Чытае грамату, змяняецца з твару. Усе засцярожаны, уважліва глядзяць на князя)*.

**Гертруда.** Кажы, сыне, кажы, як ёсць...

**Яраполк.** Вялікі кіеўскі князь Усевалад Яраслававіч, родны дзядзька наш, пазбаўляе мяне княства. Ні больш, ні менш... Мой стрыечны брат-зайздроснік Уладзімір будзе тут праз дзень-два. Сечы не мінаваць...

**Гертруда.** Мае «вочы» мне служаць верна. Апярэдзілі Усевалада. Але часу ў нас мала. Зусім няма...

**Баярын Іван.** Князь! Дай слова мовіць старому вою.

**Яраполк** *(роспачна)*. Кажы, бацька...

*Еўдакія ідзе да маці, абдымае яе. Маці цалуе яе ў светлую галаву.*

**Баярын Іван.** Мы не збяром дружыну — з удзелаў падтрымка прыйдзе гэтаксама праз два-тры дні, а сваёй дружынай паляжам усе, але Тураў не выратуем... І няхай Еўдакія мае пятнаццаць летаў, але да слоў яе не прыслухацца нельга.

*Еўдакія ўсміхаецца маці — задаволена словамі баярына. Маці сумная.*

**Яраполк** *(злосна-трагічна)*. Вось дык рада: ва Уладзіміра рука не дрогне, галава тураўскага князя пакоціцца пад лаву адразу... Ды і жанчын хіба ашчадзяць? Дачушку маю, што толькі што вочкі расплюшчыла, на свет Божы зірнула?! Сама лепш — поруб усіх чакае...

**Баярын Іван.** Трэба скарыцца, княжа. Пакуль. Я ведаю, цяжка прыняць такое рашэнне, толькі дзеля захавання сотні жыццяў, скарыся і слухай, сынок. Сёння ж, як толькі паглыне Тураў начны змрок, ты, князь, з невялікім атрадам з'едзеш у Кракаў.

**Гертруда** *(павесялелая)*. Мой брат, так, ён дапаможа! У нас адна кроў. Кароль Баляслаў II не раз вяртаў зямлю мужу майму, Ізяславу. Вяртаў да жыцця, жывіў надзеяй. Брат не дапусціць ганебнага захопу. *(Да іконы)*. Святы Пётр, дамапажы нам у гэтую чорную часіну! Не дапусці смерці людства нашага, знясіль моц, зменш гнеў Кіева, дай Тураву жыць вольна і заможна!

**Яраполк.** Гэта самае нялёгкае для мяне рашэнне. Але — такому рашэнню быць. Я еду ў Кракаў. Дзядзька Баляслаў — наша надзея.

**Еўдакія.** Ты едзеш да дзядзькі, а мы павінны чакаць?! Чакаць у невядомасці: альбо смерці альбо ратавання? Я еду з табою, Яраполк! Я не вытрымаю палону!

**Гертруда.** Дачушка, нас не крануць, мы жанчыны. Жанчыны — не ваююць...

**Яраполк.** Яшчэ што прыдумала!

**Еўдакія** *(смела)*. Яшчэ невядома ці паслухае цябе дзядзька Баляслаў. А мяне — паслухае! Хоць мне і шаснаццатае лета...

**Баярын Іван.** Ёй трэба ехаць — расцвіла князёўна Еўдакія, каб ніхто не зламаў нашу вішню...

**Гертруда.** Ратуй цябе, святы Пётр, дачушка. Яраполк, ёй небяспечна заставацца. Дзяўчына...

**Яраполк** *(незадаволена)*. Тут воля і праўда ваша. Збірайся, сястра, у дарогу. Нас чакае цяжкі шлях. Блаславі, маці!

**Еўдакія** *(шчаслівая)*. Блаславі, мамка родная!

**Гертруда** *(хрысціць і цалуе)*. Няхай пан Бог хавае, дзеці мае, і вяртае на родную зямлю, жывых, здаровых. Ідзіце, дзеці. *(Да баярына Івана)*. Я давяраю пану Богу і святым апосталам самае дарагое сваё багацце, сваіх крывінак, і табе, Іване, чуеш. Як ніхто, ты ведаеш майго брата Баляслава. І ведаеш, што сказаць, калі збаіцца запэцкацца. Бывай, мой верны, Іване!

*Баярын садзіцца на калені, княгіня-маці цалуе яго сівую галаву.*

**Гертруда** *(галасна і горда)*. Няхай жыве наш Тураў!

**Еўдакія.** Няхай вольны будзе наш Тураў.

**Яраполк.** Ён будзе вольным градам!

**Баярын Іван.** Дапамажы нам усім адзіны Бог і ўсе старыя Багі нашай зямлі!

*Зацямненне.*



## ДЗЕЯ 2

### З'ява 1

*Кракаў. Баль у палацы аднаго з магнатаў. Гучыць музыка, у віхуры танца — юныя спадчыннікі польскіх багацеяў. У цэнтры ўвагі дзівосная дзяўчынка, якую па чарзе імкнуцца запрасіць на танец галантныя кавалеры. Дзяўчынка з задавальненнем прымае чарговае запрашэнне — і танцуе, танцуе. Старыя панны і паненкі з зайздрасцю назіраюць за гэтым незвычайным дзівам, але, відаць, не ўсім падабаецца, што стаяй ля гэтай прыгажуні таўкуцца самыя багатыя жаніхі Польшчы.*

*Адзін з польскіх магнатаў прагульваецца з Яраполкам.*

**Земіслаў, польскі магнат.** Шаноўны князь! Вы самі бачыце, як гасцінна прымае Польшча сваю ўсходнюю радню. Нягледзячы на такую страту, нечаканую смерць караля Баляслава II, вам адкрыты дзверы самых багатых двароў Польшчы...

**Яраполк.** Але, пан Земіслаў, вы кажаце праўду. Толькі... сэрца баліць за Тураў, зразумейце мяне. Родны дзядзька пазбавіў мяне сэнсу жыцця.

**Земіслаў.** Такая несправядлівасць, такая жудасная гісторыя... Так, так... Калісьці я надта кахаў вашу маці, Гертруду. Хто толькі не ўздыхаў аб гэтай прыгажуні — маленькая Еўдакія так нагадвае сваю маці ў яе гады, нашу каралеўну... Глядзіце — сапраўдны цуд! І характар — які характар! Як танцуе, як да твару ёй нашы жаночыя ўборы... Каб я быў маладым!

**Яраполк.** Так, яснавяльможны пан, толькі ж мы з сястрой не на пабыўку сюды прыехалі... Няўчасна памёр дзядзька Баляслаў. А юны Мешка гасцюе ў Венгрыі, у свайго апекуна...

**Земіслаў.** Так, князь Яраполк. Аднак я выканаў вашу просьбу настолькі хутка, наколькі мог. Апякун будучага караля Польшчы, кароль Уладзіслаў Вянгерскі, атрымаў маё пасланне...

**Яраполк** *(нецярплівы)*. Добрая вестка, пан Земіслаў!

**Земіслаў.** Мой дарагі князь, набярыцеся цярпення! Я паведаміў у Венгрыю, што з сынам Гертруды да нашага двара прыбыла ягоная сястра Еўдакія, дзяўчына надта прыгожая, з жыццярадасным і смелым характарам. Вянгерскі кароль вырашыў сам неадкладна паглядзець на тураўскую прыгажуню і адразу выехаў у Кракаў. З хвіліны на хвіліну ён будзе тут з будучым каралём Польшчы. І вы атрымаеце, нарэшце, магчымасць асабіста звярнуцца са сваёй просьбай да апекуна будучага караля...

**Яраполк.** Гэта надта добрая вестка, пан Земіслаў.

**Земіслаў.** Але ж і пекная ў вас сятрыца, князь. Час ёй падбіраць пару, самы час. Такая прыгажуня можа ўвайсці ў любы дом — парадніцца палічыць за гонар любы знатны польскі род…

*Гучаць фанфары. Сціхла музыка. Здзіўленая Еўдакія ў акружэнні юных магнатаў не разумее, з якой нагоды ўсе расступіліся. Земіслаў як гаспадар і яго госць засталіся пасярэдзіне залы. Яшчэ раз гучаць фанфары і веснік абвяшчае: «Дастаслаўныя каралевіч Мешка, кароль Вянгерскі Уладзіслаў, апякун будучага караля Польшчы!».*

### З'ява 2

**Кароль Уладзіслаў** *(да Мешкі)*. Ну, вось, мой юны сябар, мы і ў Кракаве. Жыццё працягваецца. Земіслаў сабраў у сябе ўвесь цвет Польшчы *(на вуха)*. Глядзі, якая прыгажосць вакол цябе, Мешка! Эх, мне б твае гады!

**Мешка.** Такой прыгажосці я столькі наглядзеўся ў Венгрыі, шаноўны апякун, што свае мне здаюцца нейкімі бляклымі…

**Уладзіслаў** *(ціха)*. Не майго ты характару, Мешка. Я б іх… усіх... Дзе мае маладыя гады?! Эх, кіпела ж кроў! Якая там далікатнасць — любая з табой у ложак ляжа, толькі загадай!

**Мешка** *(кланяецца, адказваючы на прывітанні, сарамліва апускае вочы)*. Апякун жадае мяне так хутка пазбавіцца — гэтыя ж істоты могуць звесці са свету…

**Уладзіслаў** *(мякка)*. Нядоўга табе нецалаваным хадзіць, мой юны кароль! Вось пабачыш — ніводзін мужчына гэтага не мінуў.

**Мешка.** Для мяне галоўнае — дзяржава і справа бацькі. А жанчыны, сям'я — прыйдзе час і на іх…

**Уладзіслаў** *(таксама кланяецца і адказвае юнаму каралевічу)*. Голас мужчыны чую… (сам сабе). Што ж, пабачым, што нам падрыхтаваў сёння гаспадар… *(Голасна)*. Вітаем цябе, яснаможны Земіслаў. Вітаем усіх, панове. Доўгія лета ўсім!

*Земіслаў схіляецца ў паклоне, Яраполк стаіць воддаль.*
*Мешку гатовы з'есці вачыма паненкі, ён сарамліва апускае вочы.*

**Земіслаў.** Высокія госці — гонар майму нікчэмнаму двару. Пачувайцеся, як у сябе, каралевіч, і вы, ваша светласць. Усё, чым багаты мой дом — для вас, мае дарагія госці. Ці не стаміла вас дарога, мой юны кароль?

**Мешка.** Дарога — не, але дзядзька Уладзіслаў увесь час рэбусы мне падкідвае. Прызнавайцеся, пан Земіслаў, што прымусіла караля Вянгерскага пакінуць свае райскія сады і так тэрмінова накіравацца ў Кракаў? Мабыць, нешта важнае?



**Земіслаў.** Паверце мне: прычына таму ёсць. І важная прычына.

**Мешка.** І якая ж?

**Уладзіслаў.** Не спяшайся, сынок. Ёсць некаторыя палітычныя абставіны… І ў Польшчы зараз — госці з Усходу…

**Земіслаў.** Так, юны кароль. Князь Тураўскі Яраполк, сын вашай роднай цёткі Гертруды, каралеўны Польскай, княгіні Кіеўскай і Тураўскай, знаходзіцца ў нас у гасцях ужо другі месяц.

*Яраполк кланяецца, яму адказваюць тым жа.*

**Мешка.** Вітаем цябе, князь Яраполк!

**Уладзіслаў.** Нам радасна бачыць усходнюю галіну Пястаў!

**Яраполк.** Вітаю каралеўскіх асоб Польшчы і Венгрыі, няхай пан Бог пашле вам здароўя і доўгія лета. Прыміце прывітанне маёй княгіні-маці Гертруды, якая, на вялікі жаль, зараз, як і мая жонка Кунігунда і мая дачка, церпяць у несправядлівым кіеўскім палоне…

**Уладзіслаў.** Я ведаю, Яраполк, тваю бяду. І бяду Гертруды. Але пра справы — потым. Час церпіць. Земіслаў, не толькі ж дзеля гэтага клікаў? Ну, хваліся, дзе тваё дзіва?

**Земіслаў.** Мой юны кароль, шаноўны брат Уладзіслаў! Князь Яраполк прывёз да нас сапраўдны цуд, юную княгіню Турава — Еўдакію. Дзівосная кветка, панове, а дакранешся — можа параніць…

*Еўдакія пакідае сваіх кавалераў, схіляецца ў паклоне.*
*Уладзіслаў сапраўды ўражаны, цалуе руку дзяўчынцы.*

**Уладзіслаў** *(абходзіць вакол княжны)*. Харраство якое, Мешка!

**Еўдакія.** Але ж калючкі на мне не растуць, ваша ягамосць! Пан Земіслаў прыўздобіў занадта мой партрэт!.. Я, як бачыце, нікога не раню! Хоць і вырасла сярод дрымучых лясоў і балот…

*Усе смяюцца.*

**Мешка** *(захоплены)*. Я рады бачыць вас у Кракаве, мілая жыхарка лясоў і балот. Вы надта падобны на лясную багіню… Вы не… дазволіце… Я не ведаю, што сказаць… Вы не адмовіце мне…

**Еўдакія** *(весела, здагадалася)*. Давайце патанцуем!

**Уладзіслаў.** Вось гэта правільна! Музыкі, хопіць лайдачыць. Будучы кароль Польшчы хоча танцаваць! *(Земіславу)* Стары чорт, разгледзеў — што трэба!

**Земіслаў.** Ваша каралеўская вялікасць — дзеля Польшчы стараўся, а як жа! Не дзеля ўласных выгод.

**Уладзіслаў** *(бярэ за руку Яраполка, адводзіць у бок)*. Князь Яраполк, цяпер час — за справы… Я гатовы выслухаць цябе.

*Уладзіслаў, Земіслаў і Яраполк выходзяць. Баль працягваецца, Мешка і Еўдакія ўсміхаюцца, не зводзяць адзін з аднаго вачэй.*

**З'ява 3**

*Мешка і Еўдакія на авансцэне, у зацішку. Баль — у поўным разгары.*

**Мешка** *(трымае дзяўчынку за руку)*. Вы…

**Еўдакія.** Мы можам на ты.

**Мешка.** Ты, Еўдакія… У мяне, прабач, язык нібыта прыкарэў да нёба, калі пабачыў цябе. Не ведаю нават, што са мной адбываецца… Адкуль толькі сілы з'яўляюцца — хочацца танцаваць з табою бясконца. Цябе, мабыць, спецыяльна вучылі…

**Еўдакія** *(усміхнулася)*. Танцаваць?

**Мешка.** Так.

**Еўдакія.** Мяне больш вучылі скакаць на кані, паляваць на зуброў, чым танцаваць… Баярын Іван, які суправаджае мяне і брата ў Польшчы, не аддзяляў мяне ад хлапчукоў. Ён выхоўваў сапраўдных вояў. І мяне навучыў ўсяму, што і маіх братоў. Дзядзька Іван мяне любіць, як сваю дачку, мабыць, амаль так, як і маю маці — ён таемна любіць яе ўсё жыццё. Гэта ж так цяжка кахаць усё жыццё, як ты думаеш?

**Мешка.** Ты — дзіўная… Адкуль табе вядома… пра каханне?

**Еўдакія** *(сумна)*. Смешны… Я амаль дарослая. Маці спалохалася, што Усевалад, кіеўскі князь, аддасць мяне замуж якому-небудзь са сваіх ваяводаў, чым зневажыць наш княжы род. Усевалад не любіў майго нябожчыка-бацьку. Ён усіх нас не любіць. І я ненавіджу яго! Ён растаптаў веру тураўлян у справядлівасць…

**Мешка.** Ты вельмі разумная, смелая, і… так сумуеш. Так, ведаю чаму: цябе кліча твой дзіўны Тураў. Але ж ты не з'едзеш так хутка…

**Еўдакія.** Гэта залежыць ад размовы майго брата, князя Яраполка Тураўскага з тваім апекуном.

**Мешка.** Калі б застаўся жывы мой бацька — вы былі б ужо дома… А я вельмі б сумаваў па лясной прыгажуні…

**Еўдакія.** Ты, ты ўсё ведаеш?

**Мешка.** Днямі маё паўналецце, і я прыму карону. Стану каралём Польшчы. Цяпер я толькі ведаю, што апякун не можа прыняць ніякага палітычнага рашэння. Прабач…

**Еўдакія** *(заплакала)*. Бедны брат. Бедная маці, Ірына, маленькая Анастасія!

**Мешка.** Не плач, Еўдакія. Такія як ты — не плачуць. Ні за што не плачуць.



Я ведаю, што тваёй сям'і можна дапамагчы, але пазней…

**Еўдакія.** Гэта — немагчыма. Кароль Уладзіслаў нічога не зробіць…

**Мешка.** Але зраблю я.

**Еўдакія.** Ты?

**Мешка.** Я. Калі ты будзеш са мной побач…

**Еўдакія.** Гэта ж немагчыма.

**Мешка.** Ты станеш маёй каралевай. Я ведаю, што зараз за гэтымі сценамі апякун вядзе перамовы з тваім братам, схіляе на згоду… на наш шлюб. Яны не ведаюць аднаго: гэта будзе не палітычны шлюб, будучы кароль Польшчы толькі што зразумеў, што… пакахаў гэтую лясную прыгажунюкалючку, бойкую і смелую…

**Еўдакія** *(успыхнула)*. Гэта немагчыма! Мешка, мы сустрэліся некалькі гадзін таму…

**Мешка.** Мне казалі, што ёсць каханне з першага погляду…

**Еўдакія.** Я таксама не давала веры…

**Мешка.** Значыць, ты адчуваеш тое ж, што і я!

**Еўдакія.** Мне здаецца… я кахаю цябе. І я буду табе добрай жонкай.

*Мешка, звычайна сарамлівы, асмельваецца і цалуе дзяўчынку.*

**Мешка.** А я буду самым клапатлівым мужам. І добрым каралём.

**Еўдакія.** Божа, я буду каралевай!

**Мешка** *(трымае Еўдакію за руку, вядзе за сабой)*. Я хачу гэта аб'явіць! Слухайце ўсе!

*Уваходзяць кароль Уладзіслаў, Яраполк, баярын Іван і Земіслаў. Паны і паненкі спынілі танцы, уважліва слухаюць.*

**Мешка.** Шаноўны апякун і наш высокі госць! Пан гаспадар! Пакуль вы трымалі раду за закрытымі дзвярыма, тут, у вялікай і шчаслівай для мяне зале пана Земіслава адбылася важная падзея ў лёсе Каралеўства Польскага. Гэтая прыгожая дзяўчына, якая з-за выключнасці абставін і пэўнага збегу акалічнасцяў разам са сваім братам апынулася ў Кракаве, са згоды князя Яраполка, які тут, на шчасце, прысутнічае, і калі яе дасць, будучая каралева Польшчы, а мая жонка — Еўдакія! Мы пакахалі адно другога з першага позірку і на ўсё жыццё. Прашу з гэтага моманту князёўну Тураўскую лічыць маёй нявестай!

**Яраполк.** Як старэйшы брат — даю сваю згоду на шлюб маёй сястры, княжны Тураўскай і блаславенне ад маці нашай, княгіні Тураўскай, каралеўны Вялікай Польшчы.

*Яраполк абдымае, цалуе Еўдакію. Яна плача ад шчасця. Да князёўны падыходзіць і цалуе як дачку баярын Іван.*

**Баярын Іван.** Вось годнае месца маёй Еўдакіі. Будзь шчаслівай дачка, і памятай: ты і тураўскага роду…

**Еўдакія.** Хіба на гэта можна забыцца?

*Апякун і баярын Земіслаў, павіншаваўшы, выходзяць на авансцэну.*

**Уладзіслаў.** Што ж, разлік — правільны. Гэтая вясёлая, бойкая дзяўчына стане цудоўным дапаўненнем нашаму трохі жаноцкаму, далікатнаму і мяккаму Мешка.

**Земіслаў.** Шлюб з Еўдакіяй Тураўскай будзе мецць для Польшчы немалую палітычную выгаду.

**Уладзіслаў.** Пазней можна будзе аспрэчваць у Кіева Тураўскія землі, аб'явіўшы іх пасагам польскай каралевы.

**Земіслаў.** Справа — зроблена, кароль.

**Уладзіслаў.** Справа — за вяселлем.

**Земіслаў.** А што з князем Яраполкам? Кажуць, яго там, у Тураве, завуць яшчэ і Гаўрылам… Дзіўныя гэтыя русічы…

**Уладзіслаў.** Ён, як і маці, Гертруда, нашай рымскай веры. Мы мусім дапамагчы: мецць ў песрпектыве на кіеўскім стале князя стаўленіка святога Рыма — наша вялікая перамога. Цяпер, падаецца, у дапамозе і няма патрэбы. Мае людзі дазналіся: дзядзька вяртае яму Тураў. І Валынь. Дзіўна хіба што: з войска, што пайшло з Усеваладавым сынам Уладзімірам у Тураў, засталося паўсотні вояў…

**Земіслаў.** А дзе ж падзеліся?

**Уладзіслаў.** Спрацавала нейкая незразумелая ваенная тактыка: кажуць, нібыта старыя багі забіралі бясследна прышлых. Частка разбеглася. І войска Уладзіміра зрадзела, ён запрасіўся ў бацькі назад, у Чарнігаў. Не так проста скарыць гэтых тураўлян. *(Ідуць да ўсіх. Баль працягваецца).*

## З'ЯВА 4

*Пакой Еўдакіі. Будучая каралева ў роспачы.*

**Баярын Іван** *(хітра, па-змоўшчыцку).* Не багі стараліся — людзі. Тураўляне штоноч жыўцом тапілі ў балоце па некалькі кіеўскіх вояў. Малайчына, Еўдакія!

**Еўдакія.** Не суцяшайце мяне, дзядзька Іван. Мне так страшна заставацца адной, без вас!

**Яраполк.** Сястра. Прызнаюся: я недаацэньваў цябе. Маё вяртанне дадому — вынік твайго плана. Ты — сапраўдны вой. І ты будзеш лепшай з каралеў. Прабач, але Мешка — занадта мяккі для караля. Магчыма, разам вы зробіце Польшчу шчаслівай.



**Еўдакія.** Я заўсёды любіла цябе, Яраполк. І ўсё жыццё памятай — у цябе ёсць сястра, якая прыйдзе ў цяжкі час на дапамогу…

**Яраполк.** Толькі скажы: ты сапраўды пакахала гэтага смазлівага хлапчука?

**Еўдакія.** Больш чым жыццё. І я яго абараню. Ад ворагаў, ад злога вока. Я стану ім…

**Баярын Іван.** Мы ніколі не сумняваліся ў годнасці дачкі Турава. Няхай шчасце і ўдача будзе з табою, юная княжна! *(Абдымае, цалуе).*

**Яраполк.** Час развітвацца — мяне чакаюць у Кіеве. З дабром ці злом? Кепска толькі, што ніхто з родных цябе тут не падтрымае, не павіншуе, не пабудзе на абвяшчэнні нашай Еўдакіі каралевай. Але ж ты — моцная, маці ў цябе верыла заўжды! А мне — не вяртацца нельга: могуць пацярпець княгіня-маці, Ірына і дачушка — я так засумаваў па іх. Столькі часу прайшло — і ўсё дарэмна… Бывай, Еўдакія! *(Уваходзіць пакаёўка Ядвіга).* Беражы сваю княжну, дзеўка, як сонца яснае!

**Ядвіга** *(схіліла пакорліва галаву).* Слухаю, мой князь!

**Еўдакія.** Шчаслівай дарогі, родныя мае, на радзіму. Я птушачкай цяпер буду туды прылятаць…

*Яраполк і баярын кланяюцца і са словамі «Наша каралева», выходзяць.*

**Еўдакія** *(плача).* Я птушачкай буду туды прылятаць… Туды, на ўзбярэжжа сінявокай ракі, прыгажэйшай якой і не бачыла ніколі. Туды, дзе густыя дубровы, багатыя пушчы, і такія ў дзяцістве страшныя балаціны… Не збіраць цяпер мне там, у родным кутку, чарніцы, не спяваць дзіцячыя песні на раздоллі… Не гутарыць мне са сваёй мамачкай, не гуляць з дзяўчатамі на дзядзінцы, не вадзіць карагоды ля купальскага вогнішча. Закончылася тваё дзяцінства, Еўдакія!.. Нічога, нічога, я прывыкну… Я птушачкай туды палячу…

**Едвіга** *(абдымае княжну).* Не плач, мая красачка! Твой спакой і шчасце будзе заўсёды берагчы твая верная Ядвіга!

## З'ява 5

*Каралеўская зала ў Кракаве.*
*Прысутнічае шмат гасцей і замежных паслоў. Гучаць фанвары.*
*Уваходзяць пасля каранацыі юныя кароль і каралева.*

**Веснік.** Кароль Польшчы Мешка III і каралева Польшчы Еўдакія!

*Кароль і каралева праходзяць па зале, усе ім па этыкету аказваюць знакі павагі. Мешка і Еўдакія накіроўваюцца на трон.*

**Уладзіслаў Вянгерскі.** З ласкі Божай і па волі нябожчыка, караля Польшчы, брата нашага Баляслава II, дадзенаму мной яму слову вернаму, здымаю з сябе абавязкі апекуна па паўналеццю сына ягонага Мешкі, што сёння прымае з рук маіх грэшных дзяржаву Польскую. У вернападданасці новаму каралю прысягнулі ваяводства Польскае і ўвесь люд паспаліты. Бяры ўладу, сыне мой, і кіруй так, як твае дзяды і прадзеды кіравалі. Вітаю сястру нашу, каралеву Еўдакію — няхай яе розум і сэрца паслужаць зямлі Польскай, якая стане ёй роднай, няхай не будзе зводу вялікаму роду збіральнікаў земель Польскіх — Пястаў! Каралю і каралеве — слава!

*Пранасіцца гулка «Слава!», «Слава!»... Хутка ўсё сціхае.*

**Мешка III.** Падданыя каралеўства Польскага! Ваяводы! Браты нашы з розных зямель! Дарагі апякун. У прысутнасці ўсіх вас вызваляю караля Вянгерскага Уладзіслава ад абавязкаў апекуна і выказваю яму падзяку за ўсё, што ён зрабіў дзеля майго бацькі, нябожчыка Баляслава II, і для мяне. Пясты дабра не забываюць, і я абяцаю трымацца свайго слова. Дружба наша — непарыўная, правераная на справе. Хаця ж я ніколі не дарую ворагам нашым! Клянуся свайму народу, што працягну справы майго бацькі, захаваю тыя традыцыі, прывілеі, закладзеныя маімі продкамі. Абяцаю, што слава Польшчы будзе прымножана. Я, кароль Польшчы Мешка III шчаслівы, што маю роўную сабе жонку, каралеву Еўдакію, якой прашу слухацца, нібыта мяне самога. Мая маладая жонка дапаможа мне кіраваць дзяржавай. Такая воля мая! Няхай квітнее наша родная Польшча!

*Пранасіцца гулка «Слава каралю і каралеве!», «Слава!».*
*Гучаць фанфары. Каралю і каралеве працягваюць прадстаўляць пасланнікаў з замежных краін.*
*На авансцэне Земіслаў і кароль Уладзіслаў.*

**Земіслаў.** Ваша светласць, я забяру свае словы назад, калі мы не памыліліся.

**Уладзіслаў.** Што ты маеш на ўвазе?

**Земіслаў.** Гэтая дзяўчынка адбярэ ў нас уладу. Як піць даць!.. Мешка надта змяніўся — хто ж чакаў ад яго такой прыці. Нібыта сам Баляслаў вярнуўся...

**Уладзіслаў.** Не спяшайся з вывадамі. У любым выпадку — ты ведаеш, што рабіць. Неслухі на польскім троне нам не патрэбны. Пойдзе туды, дзе і бацька.

**Земіслаў** *(жахнуўся)*. Што?



**Уладзіслаў** *(уміхнуўся загадкава)*. А шкада. Добры хлопчык, мяккі, падатлівы. Быў...

*Плача скрыпка. Зацямненне. Шчаслівыя галасы Мешка і Еўдакіі.*

## АКТ ДРУГІ

### ДЗЕЯ 3

#### З'ява 1

*Кіеў. Цямніца. На лаве, ля акна Ірына корміць дзіця, нешта напявае. Гертруда чытае «Трырскі псалтыр» (пазней яго назавуць «Кодэкс Гертруды»)*.*

**Ірына** *(сумна)*. Столькі часу прайшло, а ад нашага таткі, Настассечка, ані вестачкі. Ці жывы, ці галаву дзе склаў?

**Гертруда.** Веры не пакідай... Мой сын і твой муж жывы, Кунігунда. І дачка мая — жывая. Я сніла сёння сон — Яраполк з божай ласкі вяртаецца. Вяртаецца...*(задумалася)*.

**Ірына.** Сон... Няхай бы і мне калі прысніўся. Не, не сніцца... Ці думае ён пра нас? Ці не забыўся? Люлі-люлі, дачушка, мая маленькая....

**Гертруда.** Не гожа жонцы князя сумнявацца. Мой сын — адналюб, ці ж ты не ведаеш? Маліся лепш Богу, нявестухна. Толькі ён дапаможа Яраполку вярнуць свой пасад, змяніць ласку Усевалада на міласць...

**Ірына.** Я малюся, з ранку да вечара малюся, маці-княгіня, але што зрабіць з сэрцайкам, калі да каханага нібы птушачка рвецца з няволі...

**Гертруда.** Святы Пётр яго абароніць, прыйдзе збавенне ад родзічаў маіх, Яраполк і Еўдакія прывядуць гэта збавенне. Толькі чорную хмару бачу над галавой князя светлага, сына майго. Барані яго, Божа, ад злой думкі і чалавека-пярэваратня...

**Ірына** *(хрысціцца і паўтарае)*. Барані Божа...

---

**У другой палове XI стагоддзя пры пасрэдніцтве дачкі польскага караля Казіміра I, жонкі кіеўскага князя Ізяслава Уладзіміравіча — прынцэсы Гертруды-Алісавы — з каталіцкага Захаду ў Кіеў прыйшоў і культ святога Пятра. Да нашых дзён захаваўся арыгінал яе Малітваслова. Ён з'ўляецца часткай лацінскага Кодэкса, атрымаўшага ў навуцы назву Кодэкса Гертруды. Упрыгожаны выдатнымі мініяцюрамі з адлюстраваннем самой Гертруды, а таксама яго сына Яраполка з жонкай Ірынай, Кодэкс уяўляе сабой пергаментны скрутак, які ўтрымлівае ў сабе старанямецкую Псалтыр канца X стагоддзя і іншыя рэлігійныя тэксты. Гертруда ўласнаручна пісала некаторыя малітвы. Яна выступала за адзінства Царквы: атмасфера недаверу паміж дзвюма галінамі хрысціянства на берагі Дняпра была прынесена грэкамі — стаўленікамі на кіеўскую мітрапаліцкую кафедру. Зараз Кодэкс Гертруды знаходзіцца ў Італіі.*

### З'ява 2

*За дзвярыма шум, адчыняюцца дзверы. Уваходзіць баярын Іван.*

**Гертруда** *(спалохана)*. Іване, ці ты гэта, верны Іване?

**Баярын Іван.** Кланяюся табе, маці-княгіня. Нізка кланяюся табе імем дзяцей тваіх, князя Яраполка і дачкі тваёй Еўдакіі! Кланяюся і табе, княгіня Ірына і дачушцы тваёй Анастасіі…

**Гертруда** *(падышла да баярына, не наглядзіцца, слёзы на вачах)*. Іване, Іване, як жа зачакаліся мы хоць нейкай весткі з Кракава… Як жа засумавалі нашы сэрцы па добрым навінам! Ці ёсць яны? Ці прыслаў дапамогу Баляслаў?

**Ірына.** Ці вярнуўся Яраполк, муж мой, каб вызваліць нас з палону ганебнага?

**Гертруда.** А дачушка, мая Еўдакія, дзе яна, маленькая крывінка? Кажы, усё кажы, баярын Іван!..

**Баярын Іван.** Дзякаваць Богу нашаму адзінаму, добрыя весткі прывялі мяне сюды. Іначай, як бы тураўскі ваявода патрапіў да вас, светлыя княгіні? Яраполк тут, у Кіеве. Кланяецца вялікаму князю Усеваладу Яраслававічу ў гэтую хвіліну. Сам Усевалад змяніў лютасць на дабро — абяцае Тураў з Валынню вярнуць князю нашаму, калі будзе… паслухмяным!

**Гертруда** *(глядзіць у малітваслоў)*. Святы Пётр! Дай сілы майму сыну! Дапамажы, навучы, падтрымай!

**Ірына** *(дачцэ)*. Чуеш, Настачка, хутка-хутка мы паедзем дадому, наш татка вярнуўся, наш татка нас абароніць!

**Баярын Іван.** Толькі чуе маё сэрца…

**Гертруда.** Надвор'е можа змяніцца? Каб хітры Усевалад не надумаў чаго…

**Баярын Іван.** Хутка князь будзе тут — мяне апярэдзіць паслаў.

**Гертруда.** Будзем спадзявацца, што Усевалад да роднага пляменніка паставіцца, як да сына… Дзе ж Еўдакія? Чаму яе няма тут? Ты ж кажы, што там, у Польшчы? Што Баляслаў? Адмовіў-такі, нягоднік, роднай сястры і пляменніку…

**Баярын Іван.** Вялікая радасць пануе на вашай радзіме, княгіня-маці. А яшчэ з дзесяць сядміц таму стаяла там жалоба.

**Гертруда** *(усхваляваная)*. Жалоба?! Божа, чорныя хмары з захаду, сон…

**Баярын Іван.** Ваш брат, кароль Польшчы, Баляслаў II, пакоіцца з мірам у сямейнай каралеўскай усыпальніцы Пястаў. Сканаў.

**Гертруда.** Што ты кажаш, баярын? Баляслаў — малады і дужы. Памёр брат мой?



**Ірына.** Божачкі, што робіцца ў свеце… Спі, мая дачушка, спі…

**Баярын Іван** *(спачувальна)*. Трымайся, мая Алісава. *(Урачыста)*. Цяпер у Польшчы новыя ўладары.

**Гертруда** *(з жахам)*. Чакай, мой пляменнік Мешка яшчэ ж малы? Няўжо вялікі род Пястаў…

**Баярын Іван.** Вялікі род Пястаў набыў яшчэ большую сілу. Ганарыся, княгіня-маці: Мешка, адзіны сын нябожчыка Баляслава II, абвянчаўся з тваёй дачкой. Еўдакія Тураўская — каралева, слаўная ўладарыня зямель Польскіх! Годная дачка сваёй маці!

**Ірына.** Наша маленькая Еўдакія — каралева!!! Мама, гэта неверагодна!

**Гертруда.** Я маліла Бога! Я спадзявалася… Мая дачушка, мая Еўдакія… Ізяслаў, зірні на свет Божы! Сыночак, Мсціслаў, парадуйцеся з намі! Якая навіна! Вось чаму на столькі сядміц зацягнуўся час нашага збавення… Якія навіны!

**Баярын Іван.** Да паўналецця Мешкі яго апякун, Уладзіслаў Вянгерскі, не мог прыняць рашэння аб дапамозе. Але яна, дзякаваць Богу, і не спатрэбілася: вялікі князь Усевалад змяніў гнеў на міласць. Уладзімір з дробнай дружынай надоечы пакінуў Тураў і зараз па дарозе ў Чарнігаў. Тураў чакае сваіх сапраўдных гаспадароў…

**Гертруда.** Значыць, план маёй Еўдакіі…

**Баярын Іван.** Удаўся. Уладзімір усё ж страціў палову сваёй дружыны. Але вінsocia так і не знайшоў. Сведкі, што праўда, былі, пацвярджалі: яго воіны, наслухаўшыся тураўскіх страхоццяў, уцякалі з Турава самі, пакідаючы нат зброю…

**Гертруда.** Хай спачываюць з мірам, нябогі…

**Баярын Іван.** Тураўскае балота стала ім вечным домам.

**Гертруда.** А брат мой, што ж так рана развітаўся з жыццём? Што кажуць у Кракаве?

**Баярын Іван.** Розная пагудка ідзе. Кажуць, не так проста сышоў на той свет Баляслаў. Атрута ціха зрабіла сваю справу… Няўгодны ён быў тамтэйшым панам, незгаворлівы, кажуць. Не ў пашане ў ваяводства быў, гарачы… На Мешку цяпер спадзяюцца: слабавольны, мяккі, даверлівы — такім кіраваць лягчэй.

**Гертруда.** Ня ведаю, цяпер, баярын, ці радавацца, ці…

**Баярын Іван.** Наша Еўдакія возьме хутка справы ў рукі. Можаш, маці-княгіня, не сумнявацца!

**Гертруда.** Дачку сваю я ведаю! Дапамажы ёй Бог! Не дай ёй паўтарыць маіх памылак! Ізяслава — не вярнуць, калі б толькі слухаўся жонкі...

**З'ява 3**

*Тыя ж, уваходзіць Яраполк. За спіной — у дзвярах — кіеўскі ваявода.*

**Яраполк.** Маці-княгіня, княгіня-жонка, дачушка!

**Ірына.** Яраполк, суджаны мой!

**Гертруда.** Сынок! *(абдымаюцца, Яраполк цалуе жонку, пасля маці).*

**Яраполк.** Родныя мае! Колькі ж дзён і бяссонных начэй я правёў у далечыні ад вас. Дачушка мая маленькая, як жа ты падрасла за гэты час!

**Гертруда.** З якімі весткамі ад дзядзькі, сынок?

**Ваявода** *(незадаволена).* Князь, паспяшайце...

**Яраполк.** Вялікі князь Усевалад Яраслававіч распарадзіўся, каб мы вярталіся ў Тураў. Ідзём, мае родныя. Збірайцеся хутка, і дадому. Нам трэба спяшацца — нас чакае невялікая дружына....

**Ірына.** Дадому, Настассечка, дадому...

**Баярын Іван.** Тураў нас чакае *(выходзяць).*

**З'ява 4**

**Ваявода** *(спыняе баярына Івана).* Не спяшайся, баярын. Сваіх не пазнаеш?

**Баярын Іван.** Цяпер разбярыся: дзе свой, а дзе...

**Ваявода.** Старыя сябры, называецца. Эх, Ванька... Як жа змяніліся часы! Якім хоць багам цяпер молішся? Сваім альбо польскім?

**Баярын Іван.** Крыўдзіш? Не трэба! Нядобрыя часы прыйшлі. І нас падзялілі. Ты ў Кіеве, Яраславічам служыш. Я ж — па-ранейшаму, з Ізяслававым коранем... Нібыта і сябры, а нібыта...

**Ваявода.** Не вораг я табе, Іване. Толькі папярэдзіць хачу: нядобрае ў галаве вялікага князя. А Ізяслава сынок — для яго сур'ёзная пагроза. Забыць прыходы Баляслава Кіеву цяжка... Не сёння, дык праз час гэтае раптоўнае дараванне скончыцца. Чуў, радня ў Польшчы голас падняла. Такое заступніцтва дай Бог кожнаму, але сяму-таму косць у горле...

**Баярын Іван.** На адно заходняе заступніцтва тураўскія князі не прывыклі спадзявацца! Свой розум — не мякіна...

**Ваявода.** Так то яно так, але беражы князя, Іван. Як Ізяслава бераглі мы разам. Над яго сынам рой вос... І не крыўдуй — стары я Багоў візантыйскіх на рымскіх мяняць.



**Баярын Іван.** Не думай, што і я Пятру кланяюся... Адзін Бог у душы. Ранейшы. А Алісава — яна жанчына, няхай цешыцца...

**Ваявода.** Гэта яшчэ адна прычына засцерагацца князю — рымскай веры ён... Бывай, стары дружа! *(выходзяць).*

**З'ява 5**

**Гертруда** *(вяртаецца).* Божа, усявышні Божа! За такімі радасцямі галава закружылася... Дзе ж ты, мой маліртваслоў? *(шукае і знаходзіць на лаве).* Вось ён... *(прыціскае да грудзей).* Мая адзіная падтрымка... Як я магла забыць сваю святыню? Мае малітвы... Святы апостал Пётр... «Oratio pro Papa»... Божа, мае нязбытныя мары... Але прыйдзе час і маё слова, слова Папы будзе на гэтай дзікай зямлі адзіным. І сын мой, Яраполк, прывядзе гэтую краіну ў лен святога Пятра... Клянуся! Цяпер — на адзін крок бліжэй да мары... І Еўдакія, мая Еўдакія — будзе мне памочніцай у маёй нялёгкай місіі. Дай моцы духоўнай і фізічнай, Божа! *(становіцца на калені, моліцца на лацінскай мове).*

**Баярын Іван** *(кліча).* Алісава, маці-княгіня... Час адпраўляцца.

**Гертруда.** Даруй, Божа!

**Баярын Іван.** Ты размаўляла з Богам, я перашкодзіў. Прабач. Толькі...

**Гертруда** *(устае з каленяў, слухае яго).* Цябе нешта турбуе, Іван?

**Баярын Іван.** Ведаеш, Алісава, што сказаць хачу...

**Гертруда.** Кажы, мой Іване...

**Баярын Іван.** Магчыма, нам не будзе як пагаварыць больш... Няведама, чым скончыцца дарога дадому.

**Гертруда.** Што ты гэтым хочаш сказаць...

**Баярын Іван.** Заўтра нас... можа не быць.

**Гертруда.** Усевалад? Ты думаеш ён...

**Баярын Іван.** Бачыў прыстаўленую дружыну — дваццаць вояў. Ніводнага тураўляніна. Хіба ж не, з адным, быў час, сустракаўся. Нярадцам клічуць — некалі Ізяславу служыў... Толькі ці можна яму цяпер верыць?

**Гертруда.** Няўжо Усевалад згубіў розум?

**Баярын Іван.** Лепш — памыліцца. Але трэба трымаць вока...

**Гертруда.** Твая праўда, баярын. Папярэдзь Яраполка.

**Баярын Іван.** Ведаеш, княгіня. Я, мабыць, доўга жыў для воя. Таму і хачу сказаць адно табе, Алісава: кахаў я цябе моцна і гэтак жа кахаю. Буду кахаць да апошняга сонечнага світання, якое падорыць мне жыццё. На ўсякі выпадак — можа, гэта і апошні раз — зрабі мне падарунак...

**Гертруда.** Які ты хочаш мець ад сваёй княгіні падарунак, Іван?

**Баярын Іван.** Пацалуй мяне так, нібыта я — Ізяслаў…

**Гертруда.** Ты — стары дурань, Іван. Я не старая яшчэ жанчына, і не пазбаўлена маленькіх радасцей…

*Яны цалуюцца — шалёна, апантана.*

**Гертруда** *(вылузваецца)*. Хопіць, Іван…

**Баярын Іван.** Зорачка мая ясная… Мне цяпер нічога не страшна: ні смерць, ні расстанне. Ты дала мне новае жыццё…

**Гертруда.** Тураў чакае, Іван. Пайшлі… Чакай… Калі раптам… з Яраполкам альбо са мной нешта здарыцца, абяцай… Абяцай: мой малітваслоў павінен патрапіць у рукі маёй дачкі. Больш ніхто, Іван… Пабажыся…

**Баярын Іван.** Даю слова, мая княгіня…

*Зацямненне.*

## ДЗЕЯ 4

### З'ява 1

*Кракаў.1089 год. Надвячорак. Напрадвесні. Каралеўскі стары парк. Мужчыны ў чорных накідках.*

**Першы.** Што здарылася? Я ж папярэджваў: сустрэчы толькі ў выключным выпадку.

**Другі** *(шэптам)*. Якраз той выключны выпадак і прыйшоў.

**Першы.** Адкуль — звесткі?

**Першы.** З дакладных крыніц. Правераны чалавек…

**Другі.** Глупства. Кароль не можа дакладна ведаць, хто атруціў Баляслава. Усе — даўно там… *(паказвае на нябёсы)*.

**Першы.** Не ўсе, значыць. Завёўся нячысцік…

**Другі.** Хаця ж… Магчыма і так. Мешка як адцураўся ад мяне. Прывячае, але раду вядзе з пазнаньскімі ваяводамі. А з кракаўскімі насцярожліва. Нешта тут не так…

**Першы.** Здагадваецца, праўду кажу. Ды і паўсюль гэтая руская нягодніца. Без яе слова Мешка кроку не зробіць. Як зачаравала сaплячка. Свае правілы ў каралеўстве заводзіць. Наш Мешка да такога не дадумаўся б. Улада, як пясок — была ды праз пальцы сышла…

**Другі.** А народ іх любіць. Чуў, надоечы, каля брамы: бацькам і маткай называюць караля і каралеву. Хто б мог падумаць, што так павернецца?

**Першы.** Што будзем рабіць?

**Другі.** Час вырашаць праблему…



**Першы.** Цыц!!! Нехта ідзе…

**Другі.** Каралева!

*Знікаюць у цемры.*

### З'ява 2

**Ядвіга** *(каралеве)*. Якое цудоўнае надвор'е, мая каралева! Хутка вясна!

**Еўдакія** *(азіраецца)*. Мне падалося, тут нехта быў…

**Ядвіга** *(азіраецца)*. Нікога… Падалося табе, мая каралева!

**Еўдакія.** Ох, натамілася я за дзень, Ядвіжанька, сяброўка мая сардэчная… Апошнім часам няўтульна ў каралеўскім палацы. Душна. Млосна… Адчуваю сябе…

**Ядвіга.** Няўжо, Еўдакійка, мая каралева, гэта здарылася?

**Еўдакія** *(зласнавата)*. Павер: загадаю вырваць табе язык, калі ляпнеш каму без меры! Я сама яшчэ не пераканалася… Была б тут мая мамачка!.. Як яны там, мае родныя? Столькі часу прайшло, а ніводная салоўка з радзімы не прыляцела, песню мне не праспявала… Ніводнай вестачкі… Каралева, а ўсё роўна як у цямніцы. І Мешка пакінуў адну, з'ехаў некуды… І не папярэдзіў. Хутчэй бы ўжо вярнуўся!

**Ядвіга.** І маё сэрцайка засумавала па родным краі… Каб не мая каралева, здавалася б, пешшу пайшла да цяцінай хаткі…

**Еўдакія.** І я сумую. Але ж нічога не паправіш. Толькі ў няведанні жыць…

*Уваходзіць кароль.*

**Мешка.** А вось ты дзе, сонца маё! *(зірнуў на Ядвігу, яна знікае)*.

**Еўдакія.** Ты пакрыўдзіў мяне, Мешка. Чаму не сказаў — куды сышоў?

**Мешка** *(смяецца, абдымае, цалуе)*. Каханая, ты ж ведаеш — дзяржаўныя абавязкі. Я ж кароль!

**Еўдакія** *(найграна смяецца)*. А я, наколькі мне не здраджвае памяць, твая каралева. І ведаць павінна…

**Мешка.** Я так моцна цябе кахаю! І…

**Еўдакія.** Мешка, нешта здарылася? Я адчуваю ж — ты нейкі не такі. Так, прызнавайся сваёй каралеве!

**Мешка.** Еўдакія, не выдумляй. Я такі як звычайна. І нічога не здарылася. Я так моцна люблю цябе і сваю Польшчу…

**Еўдакія.** Маніш. Па вачах бачу…

**Мешка.** Каралева!

**Еўдакія.** Кароль!

**Мешка.** Ну і настырная! Адкуль толькі ў цябе гэтая настырнасць? Камень скрышыш…

**Еўдакія.** Гэта ад мамы… Але не адгаворвайся, кажы праўду!

**Мешка** *(расчулена)*. Я надта любіў свайго бацьку…

**Еўдакія.** Здзівіў. Хіба гэта навіна?

**Мешка.** Пачакай, Еўдакія…

**Еўдакія** *(напышліва)*. Слухаю, мой кароль!

**Мешка.** Не дуркуй. Мне — кепска…

**Еўдакія** *(здзіўлена)*. Мой любы захварэў?

**Мешка.** Дзяўчынка непаслухмяная! Мне кепска — ад праўды!

**Еўдакія.** Праўды…

**Мешка.** Так, страшнай праўды. Майго бацьку… забілі! Я не ведаў, не задумваўся аб прычынах яго такой раптоўнай смерці. І вось…

**Еўдакія.** Божа мой, цябе трасе ўсяго, Мешка…

**Мешка** *(плача)*. Разумееш, яго атруцілі. Змова. І я хутка даведаюся хто! Неверагодна! Блізкія мне…

**Еўдакія.** Ціха, Мешка… Не кажы больш нічога! І плач, Мешка. Плач, любы! *(кароль сутаргава, як дзіцё плача, на каленях)*. Мы адпомсцім, мой муж, мой слаўны Мешка, і за бацьку твайго, слаўнага караля Баляслава, і за майго татку, вялікага князя Кіеўскага Ізяслава… Толькі адумліва ўсё, не спяшайся. Я дапамагу табе, любы!

**Мешка.** Так, мая маленькая каралева. Я шчаслівы, што ты ёсць у мяне, Еўдакія! Сам гасподзь паслаў цябе ў Польшчу…

**Еўдакія.** Пан Бог нам дапаможа справіцца з ворагамі… Мой Мешка!

**Мешка.** Мая Еўдакія! *(цалуюцца і ідуць у палац)*.

**З'ява 3**

*Вяртаюцца мужчыны ў чорным.*

**Першы.** Твая праўда!

**Другі.** Я слоў на вецер не кідаю!

**Першы.** Руская дзяўчынка правіць баль! Дажыліся!

**Другі.** Заўтра яе баль…

**Першы.** Маўчы. І ўначы ёсць вушы!

**Другі.** У нас яшчэ ёсць час.

**Першы.** Кожны крок караля і гэтай рускай бестыі павінен быць мне вядомы!



**Другі.** Мае людзі ў палацы правераныя…

**Першы.** Глядзі мне. Калі што!

**Другі.** Я — чалавек слова!

*Знікаюць у цемры.*

**З'ява 4**

**Баярын Іван** *(аглядаецца)*. Што я чую? І тут — змовы! Страшны час! Як жа ты тут, наша маленькая Еўдакія? Ці згадваеш свой Тураў? Ці такая ж ты, як і раней? Ці не засумавала па сваёй роднай старонцы, тураўская прыгажуня? Цямнее хутка… Магчыма, кароль і каралева ўжо збіраюцца да сну… Што ж, можна было б і да заўтра пачакаць з такімі горкімі навінамі…

**Ядвіга** *(бяжыць насустрач)*. Я не паверыла вершніку, ажно яно сапраўды так!.. Дзядзька Іван! Вы тут! Якая радасць, дзядзька Іван! Якое шчасце, што вы тут… Каралева ўжо ведае: такі госць!

**Баярын Іван** *(здзіўлена)*. Ядвіга, каралева прыме мяне сёння?

**Ядвіга.** Так. Еўдакія з каралём ідуць сюды! Ад радасці яна ажно заплакала!

**Баярын Іван.** Слава табе, Усявышні: дачка тураўскай зямлі не адракласся, ранейшая!

**Ядвіга.** Дзядзька Іван, як там Тураў?

**Баярын Іван.** Жыве Тураў… Надоечы маці тваю, Маланку, сустрэў, кланяцца прасіла. Брат старэйшы твой, Мікола, жонку ў хату прывёў, дзіця чакаюць па вясне.

**Ядвіга.** Радасць якая… Матулі маёй, як прыйдзецца, скажыце: добра мне каля каралевы, толькі сумую па радзіне сваёй, па Тураву...

**Баярын Іван.** Скажу, дачка…

*З'яўляюцца кароль і каралева.*

**Баярын Іван.** Паклон вам нізкі, дастаслаўны кароль Мешка і каралева Еўдакія! З пасланнем да вас, з даручэннем ад княгіні Алісавы Тураўскай.

**Мешка.** Рады бачыць за госця, баярын!

**Еўдакія.** Я так чакала цябе, дзядзька Іван! Ці здаровыя ўсе пры двары, ці ў тваёй сямейцы ўсё ў парадку? Кажы, кажы, дзядзька Іван, а то сэрца маё не вытрымае… Так маркоцілася па родным краі…

**Мешка.** Кажы, баярын, што наказала маці-княгіня!

**Баярын Іван.** Дастаслаўны кароль, мая каралева! Нярадасныя весткі прывёз я з сабою ў Польшчу.

**Еўдакія** *(спалохана)*. Мама?!

**Мешка.** Цішэй, Еўдакія, супакойся…

**Баярын Іван.** Алісава ў жалобе. Ужо паўгода, як Тураўская зямля без князя.

**Еўдакія** *(цяжка)*. Мой слаўны брат, Яраполк!.. Што здарылася? Кажы, дзядзька Іван, кажы, як ёсць…

**Баярын Іван.** Вялікі князь Усевалад Яраслававіч змяніў гнеў на міласць — вярнуў Яраполку Тураў і Валынь. Ды не ўратавалі мы свайго князя: праз некалькі дзён па дарозе ў Тураў Яраполк быў забіты падкупленым нягоднікам Нярадцам з дружыны, якую прыставіў Усевалад.

**Еўдакія** *(плача)*. Божа!

**Мешка.** Не плач, маё сонейка. Слязьмі гору не паможаш…

**Еўдакія.** А маці?

**Баярын Іван.** Алісава ў роспачы не выходзіла са сваіх пакояў аж трынаццаць сядміц. Адмаўлялася ад яды і… малілася.

**Еўдакія** *(роспачна)*. Спачатку Мсціслаў, пасля бацька. І вось — не стала Яраполка…

**Баярын Іван.** Столькі гора выпала на яе галаву! Але ёсць і радасная вестка: княгіня Ірына зноў нарадзіла дачушку. Шкада, нябожчык-князь не пабачыў сваё дзіця. Алісава цяпер як ажыла: унучка дала ёй сілы… І Анастасія падрастае. Княгіня Ірына наказала кланяцца вам!

**Еўдакія.** Святы Пётр, падтрымай маіх родных!

**Мешка.** Ты здарожыўся, баярын — адпачні. І не спяшайся дадому. Заўтра 18 летаў маёй маленькай каралевы. Будзе шыкоўны баль…

**Еўдакія.** Які баль, калі на душы так цяжка? Яраполк, мама…

Мешка. Мая каралева! Гэта будзе самы сапраўдны баль. Яраполк загінуў — не вернеш. Жыццё ж працягваецца. Баль — мой падарунак табе. І не спрачайся — запрашэнні ўжо атрымалі ўсе знатныя людзі Польшчы…

**Еўдакія.** Мой мілы Мешка… Дзякуй табе. І табе, дзядзька Іван, дзякуй. Хоць і балюча мне… Няхай пасля балю па Яраполку адслужаць службу ва ўсіх храмах Польшчы.

**Мешка.** Так будзе, маё каханне.

**Баярын Іван.** І я не з пустымі рукамі, Еўдакія, прыехаў. Але падарунак — заўтра. Дабранач, дастаслаўны кароль! Дабранач, мая каралева!

*Зацямненне.*

### З'ява 5

*Наступны вечар. Кракаў. Каралеўскі палац.*
*У зале — польскія ваяводы з жонкамі, шматлікія госці.*
*Закончыўся паланез, кароль з каралевай накіроўваюцца да трона.*

**Кароль Мешка III.** Мая дарагая каралева зрабіла сёння, у дзень свайго нараджэння, мне каралеўскі падарунак. У каралеўскай сям'і хутка з'явіцца



спадчыннік. Будзе мець працяг старажытны род Пястаў на святой Польскай зямлі. Вялікая радасць напаўняе маё сэрца. Я ганаруся сваёй каралевай. Слава Еўдакіі!

*Прысутныя апладзіруюць, усміхаюцца, віншуюць: «Слава каралеве!»*

**Кароль Мешка III.** Каралеўская сям'я атрымала пасланні ад нашых вянцаносных братоў-суседзяў. Мы ўдастоены ўвагі яго святасці Папы Рымскага. Сёння з намі разам наш брат, мой былы апякун, кароль Венгрыі Уладзіслаў. Мы рады вітаць у гэтай зале радню з Усходу, прадстаўніка княгіні Гертруды, дачкі Польшчы і каралеўскага дому, нашай маці…

**Земыслаў** *(збоку, каралю Вянгерскаму)*. Гэта знявага, ваша вялікасць! Нейкі баярын — раней караля, апекуна, будзе віншаваць польскую каралеву — небачана такое!!!

**Уладзіслаў Вянгерскі** *(па-змоўшчыцку, раскланьваюцца)*. Няхай дзіця цешыцца ўладай!

**Веснік** *(гучаць фанфары)*. Баярын Іван, пасланнік з Турава.

**Баярын Іван.** Кланяюся нізка каралю і каралеве ад Тураўскай зямлі! Перадаю цёплае прывітанне ад уладарыні нашага краю — княгіні Алісавы. Ваша маці, каралева, да гэтага памятнага дня даслала адмысловы падарунак. Сказала яна так: больш чым золата і брыльянты, якіх у юнай каралевы дастаткова. Гэта малітваслоў, заказаны вашым нябожчыкам-бацькам, вялікім князем Ізяславам, для вашай маці, у нямецкай старонцы, дапоўнены пасля малітвамі, напісанымі рукой нашай княгіні-маці. Прымі, каралева, матулін падарунак! Жыві, паважай мужа свайго і народ свой, як маці твая палюбіла народ тураўскі, палюбі гэтую старонку як сваю родную! Няхай квітнее Польшча! Слава каралю і каралеве!

*Прысутныя апладзіруюць, усміхаюцца, віншуюць:*
*«Слава каралю і каралеве!»*

**Мешка.** Кароль жадае мець тост за сваю каралеву і яе маці, княгіню Гертруду!

**Еўдакія** *(удзячна, закахана)*. Дзякуй табе, мілы!

**Земыслаў** *(узрадавана)*. Віна каралю!

**Мешка** *(галасна)*. Віна ўсім гасцям караля! Кароль Уладзіслаў!

**Кароль Уладзіслаў** *(трымае келіх у руках)*. За вялікі род Пястаў! Слава Пястам!

**Мешка.** За маю каханую і за маю цешчу. За нашу Польшчу!

*Усе паўтараюць: «Слава Польшчы!»; гучаць фанфары.*
*Мешка выпівае віно з келіха, хоча пацалаваць каралеву, але сілы раптам пакідаюць яго, падае са словамі «Мая бедная Еўдакія!..»*
*Усе адыходзяць ад караля, толькі каралева схілілася над ім.*

**Еўдакія** *(плача, у роспачы; цалуе мёртвага мужа)*. Мешка, мой мілы Мешка! Ты адчуваў, ты адчуваў, што так будзе. Пайшоў ужо, пакінуў мяне… Куды, навошта? Божа, ты ўсё бачыш! Ты — сведка. Мой хлопчык, мой кароль! Мой адважны муж… Даруй гэтым няшчасным, сляпым кратам, не ведаючым, што робяць. Звяры, звяры, што вы нарабілі? Спі, мой кароль. Твая каралева хутка прыйдзе да цябе…

*Зацямненне. Звіняць званы Кракава…*

## ПАСЛЯСЛОЎЕ

*Не змагла адпомсціць за свайго брата Яраполка Еўдакія, бо яе шчасце і ўлада ў Польшчы мелі такі кароткі перыяд. Мешка III з яе дапамогай быў надта добрым каралём. Летапісец не прамінуў запісаць: «…так мудра і разумна павёў сябе, так следаваў старажытным традыцыям сваіх папярэднікаў, што выклікаў захапленне ўсёй радзімы». І тут юны кароль раптам даведаўся, хто забіў яго бацьку Баляслава II. Баючыся расправы, феадалы насыпалі атруты ў віно, якое асабліва любіў юны кароль. Яд пачаў дзейнічаць адразу, і Мешка імгненна сканаў. Яго аплаквала ўся Польшча, але больш усіх праліла слёз маладая ўдава, Еўдакія Тураўская. Ніводная смерць князя ці караля ў той час, нават у варварскіх народаў, не аплаквалася гэтак доўга і з такім смуткам, і ніводнае пахаванне, нават вялікіх правіцеляў, не было адзначана такой жалобай….*

*Як склалася далейшае жыццё дзяўчынкі-каралевы — невядома і дагэтуль.*

*Хіба ёсць адна здагадка. Праз восем стагоддзяў, пры адкрыцці фундамента храма XII стагоддзя ў Тураве звонку ў саркафагу знойдзены астанкі семнаццаці-дзевятнаццацігадовай дзяўчыны. Простага чалавека наўрад ці пахавалі б побач з храмам. Толькі княскага роду асоба магла быць пахвана тут. Магчыма, Еўдакія не вытрымала смерці мужа, і, вярнуўшыся да маці ў Тураў, налажыла на сябе рукі, апошні раз зірнуўшы на тураўскае неба? І цяпер на той саркафаг, у якой ляжыць, магчыма, каралева Польшчы Еўдакія, стаў турыстычнай загадкай… Магчыма, гэта сапраўды яна. Тая, каго так любілі польскія кметы (сярэдневяковыя польскія сяляне) і простыя тураўляне, ваяводы і баяры, князі і каралі…*

*Толькі ж жыццё не спынілася…*

*Тураўская княгіня Гертруда была ў роспачы. Яе ўсе планы правальваліся. Але як адпомсціць мужу брата за смерць сына? І дачка, каралева Польская, таксама ўжо не памочніца. У Польшчы — новы кароль. Як дамагчыся самастойнасці Тураву?*



*Выкарыстаўшы тое, што Тураў часова застаўся без князя, Гертруда (Алісава) на правах першай асобы ў княстве заключыла своеасаблівы дагавор з полацкім Усяславам Чарадзеем, аддаўшы дачку Яраполка Анастасію за яго сына Глеба (пазней Глеба Менскага), з надзеяй, што разам будзе лягчэй весці двум княствам барацьбу за незалежнасць супраць ненавіснага Кіева. Аднак нічога не суджана было адбыцца.*

*У Тураве праз нейкі час стаў княжыць Святаполк, малодшы сын Гертруды. Як маці ні старалася яго памірыць з Усяславам Чарадзеем — нічога не выйшла. Праз пяць гадоў ён стаў вялікім кіеўскім князем, але Тураў не атрымаў новага правіцеля, бо Святаполк пакінуў за сабой горад. Фактычна атрымлівалася, што па-ранейшаму надзённыя справы тураўцаў вырашала імі паважаная княгіня Гертруда. Сама ж княгіня, хоць і пастарэла, не адступілася ад аднойчы абранага палітычнага накірунку: выхавала і аддала замуж у Польшчу дзвюх сваіх унучак, дачок Святаполка. Гертруда да скону жыла адным — каб яе Тураў стаў незалежным, дзеля гэтага не аднойчы змяняла праваслаўную веру на каталіцкую і наадварот…*

**2007 г., вясна.**